# Салігорск вячэрні



Вуліца Ленінскага камсамола.
Фота Ф. РАМАНОЎСКАГА, рабочага другога калійнага камбіната.

# Важак брыгады

Усё новыя і новыя дамы вырастаюць на вуліцах Салігорска. Спачатку іх будавалі з цэглы, якую прывозілі з Мінска на аўтамашынах, а затым, калі расправіў свае плечы завод жалезабетонных вырабаў, сталі збіраць з буйных блокаў.

А вось сёння па асфальтавай дарозе ад завода да горада імчаць спецыяльныя машыны, якія вязуць панелі з гатовымі вокнамі, дзвярыма. Дастаткова будаўнікам саставіць іх чатыры — і пакой гатовы. Следам за ім складваецца другі, трэці, а там, глядзіш, і цэлы паверх. Таму ніхто тут не здзіўляецца шпаркім тэмпам будаўніцтва. Але, напэўна, не ўсе ведаюць пра тых, чымі рукамі вырабляюцца будаўнічыя дэталі.

... Прасторныя цэхі завода жалезабетонных вырабаў. Рэдка дзе ўбачыш людзей, іх працу замяняюць разумныя машыны.

Невысокі, шырокі ў плячах Іван Лахвіч яўна незадаволен, хвалюецца. Ужо каторы дзень бываюць перабоі з падачай бетону на касеты. А тут яшчэ і арматуршчыкі парой падводзяць. І брыгадзір паспяшае ліквідаваць недаробкі.

Такі ўжо характар у камуніста Лахвіча, што непаладкаў не пацерпіць, браку не дапусціць. З першых дзён працуе ён на будоўлі, не адну змену падрыхтаваў сабе.

— Што б там ні было, — супакойваў сваіх рабочых брыгадзір, — а план выканаем.

Патрабавальнасць, прынцыповасць брыгадзіра далі свае вынікі: к канцу месяца калектыў набраў тэмпы і паспяхова выканаў заданне.

— Так і будзем трымаць,— запэўнілі будаўнікоў рабочыя, — з-за нас прастояў не будзе.

... Пасля змены Іван Лахвіч любіць прайсціся па вуліцах маладога горада, паглядзець, як ідуць справы ў будаўнікоў. І кожны раз ласкавая ўсмешка асвятляе яго твар, бо крупіца і яго працы ўкладзена ў многія дамы.

П. АНДРЭЕЎ.